


## У НУМАРЫ

**_Навіны_**

**Кніга водгукаў**

**"Асоба" – персанальная выстава мастачкі Анастасіі Балыш**

**Успаміны і персаналіі**

**На свяце ў Маладзечна**

**_Навуковая праца_**

**Заслаўе ў беларускай культуры**

**Подстаканник – оригинальный предмет ушедшей эпохи**

## _Навіны_

### Кніга водгукаў

**2018**

"Выражаем благодарность за интересную экскурсию! Успехов в работе!" (г. Брест, СШ №12, 24 сакавіка).

"Хотелось бы поблагодарить за приятное время, познавательную экскурсию. Как заславчанке было безумно приятно услышать и узнать новые факты исторические" (Бабенка Г.А., 28 сакавіка).

"Огромное спасибо администрации музея, особенно благодарим экскурсовода Елену Вячеславовну (Пакінка) за интересную экскурсию для наших деток из детского сада №3 г. Заславля, дети очень внимательно слушали, были заинтересованы, много узнали интересного. Желаем всем здоровья, благополучия" (4 красавіка).

"Как же у вас интересно; выставка, рассказы экскурсоводов. С удовольствием узнали больше об истории Заславля и с радостью приедем к вам ещё. Спасибо" (сям'я Сухарка, г. Мінск, 26 мая).

"Была здесь раз 5, но с каждым разом всё интереснее" (дзіцячы аздараўленчы лагер "Салют", г. Барысаў, 13 чэрвеня).

"Es mi primera vez er Bielorrusia y el pais es hermoso! Muchas cosas gue ver, lugares gue visitar y gente encantadora. Recomiendo visitarla" ("Упершыню ў Беларусі, краіна выдатная! Шмат што можна пабачыць, багата мясцін наведаць і цудоўныя людзі. Рэкамендую наведаць", госць з Эквадору (Ecuador), ліпень).

"Спасибо огромное экскурсоводу Дмитрию (Фраленкоў) за интересную экскурсию и рассказ о музыкальном прошлом Беларуси" (Аксана, Расійская Федэрацыя, 21 ліпеня).



*Кніга водгукаў музея-запаведніка,*
*якая захоўваецца ў музейна-выставачным комплексе*

"Пусть всё у Вас состоится. Пусть приедут к Вам добрые люди. Пусть будет у Вас здоровье и добробыт! Огромное Спасибо за всё, что Вы делаете. Уезжаем с надеждой, что приедем и привезём к Вам своих детей и внуков. Процветайте!" (Раённая арганізацыя Чырвонага Крыжа, г. Мінск, 2 жніўня).

"Es un museo my interesante y ciudado (cuidado), espero gue sifa crecicudo" ("Гэта цікавы і акуратны музей, спадзяюся, ён будзе расці", Іспанія, Мадрыд (Espana, Madrid), Antonio Lopez, 5 жніўня).

"Очень благодарны всему коллективу, интересно, эмоционально, запо минающе!" (УП "Минскводоканал", ЦРП "Водосбыт", г. Мінск, 22 верасня).

"Огромное спасибо за работу музея, за экскурсию! Берегите прошлое, это важно для будущих поколений" (госці з г. Харкаў, Украіна, 30 верасня).

"Большое спасибо за тёплый, душевный приём! Очень интересный рассказ о музыкальных инструментах, их истории и создании. С приветом из России! (Надзея, г. Масква, Расійская Федэрацыя, 4 кастрычніка).

"Уважаемые сотрудники музея! Благодарим Вас от имени группы туристов из Полоцка за прекрасную экскурсию. Всем здоровья и добра!" (13 кастрычніка).

"Хочацца выказаць словы падзякі супрацоўнікам музея за цікавую экскурсію, за эмоцыі, якія мы атрымалі, звярнуўшыся ў наша мінулае. Поспехаў вам!" (экскурсанты з г. Барысава, 20 кастрычніка).

"Усё цудоўна. Вельмі спадабалася. Экскурсанты быццам трапілі ў іншую рэчаіснасць. Вялікі дзякуй!" (31 кастрычніка).

"Спасибо огромное за полноинформационные экскурсии по музеям: "Кузница", "Млын", "Завозніцкая гасцініца", "Музыкальных инструментов", "Гобеленов". Пусть развивается дело просвещения, познания жизни предыдущих поколений людей и передачи живительной информации новым поколениям людей. Храни Вас Бог!" (прыход Раства Іаана Прадцечы, г. Мінск, 18 лістапада).

**"Асоба" – персанальная выстава мастачкі Анастасіі Балыш**

Ці звяртаем мы ўвагу на тое, як размаўляем, якія словы і формы звароту выкарыстоўваем? Ці прытрымліваемся культуры прыгожага маўлення?

У ранейшыя часы гэтай справе надавалася вялікая ўвага. Лісты дзеячоў гісторыі, культуры і мастацтва XVIII-XIX стст. з’яўляюцца прыкладам прыгожага маўлення даўняга часу, які натхніў Анастасію Балыш і яе аднадумцаў на праект “Шляхетная гаворка”, звязаны са зваротам увагі на пашырэнне памяці аб выбітных асобах беларускай мінуўшчыны, а таксама – з пашырэннем прыгожага маўлення, якое было для іх уласцівым.

На выставе “Асоба”, галоўным чынам, увазе наведвальнікаў прадстаўлены карціны (партрэты выбітных дзеячоў), непасрэдна звязаныя са згаданым вышэй праектам, а таксама – некаторыя іншыя работы, але ўсё той жа тэматыкі (персаналіі), аўтарства мастачкі Анастасіі Балыш.

Стваральнікі праекта “Шляхетная гаворка”, разумеючы, што зараз значная частка стасункаў людзей канцэнтруецца ў мэсэджэрах,

распрацавалі адмысловыя сцікерпакі шляхетнай або прыгожай гаворкі, якія можна выкарыстоўваць у вайберы і тэлеграме ў штодзённых размовах.



*Абрыс адной з частак (у тым ліку – цэнтральнай) выставы “Асоба”*

А асобы на іх самыя розныя: тут Вы пабачыце Напалеона Орду, Міхала Клеафаса Агінскага, Енджэя Снядэцкага і іншыя. Спампаваць сцікерпакі можна бясплатна, qr-коды для гэтага Вы знойдзеце ў дадатковых выявах.

Тэлеграм

Вайбер

Qr-код для спампоўвання сцікераў “Напалеон Орда” ў telegram; qr-код для спампоўвання сцікераў “Енджэй Снядэцкі” ў viber

Выстава дзейнічае ў музейна-выставачным комплексе музея-запаведніка з 1 чэрвеня па 5 ліпеня.

*Працягваем друк успамінаў Аляксандра Калбаскі (пачатак у №9). Дадаткова адзначаем, што матэрыял, адлюстраваны ва ўспамінах, цэласна сфармаваўся ў 1999-2000 гг., таму не ўсе закранутыя ў ім аспекты могуць цалкам адпавядаць сённяшняму бачанню спецыялістаў музейнай справы. Матэрыял друкуецца фактычна без зменаў (або з мінімальнымі), апрача, галоўным чынам, захадаў скарачэння аб'ёму [Рэд.]*.

***Як пачыналася***

## МУЗЕЙНЫ НАВІГАТАР,
## ЦІ ПАРАДЫ МУЗЕЙНАГА ДЫРЭКТАРА

### Дзе можна атрымаць адукацыю па музеязнаўчай спецыяльнасці і дзе прайсці перападрыхтоўку?

Ніжэй прыведзеная інфармацыя дае толькі штуршок – падказвае ідэю і называе адрас (выдатна ведаю, як часта толькі гэтага бракуе). Астатняе – справа настойлівасці і ступені жадання. Хто не стукае, таму не адкрываюць.

Усяго ў свеце існуе больш за 250 праграм музейнай падрыхтоўкі розных узроўняў і форм ідэнтыфікацыі: пасведчанне, дыплом, ступень бакалаўра і магістра.




*Аляксандр Калбаска.*
*Прэзентацыя кнігі “Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя”, 2000 г.*

Знаходзяцца гэтыя цэнтры ў розных краінах, праводзяць падрыхтоўку па ўсіх магчымых спецыяльнасцях і спецыялізацыях, рознай працягласці (ад месяца да 4-х гадоў). Памеры аплаты таксама розныя (ад $900 да $10 000 у год), існуюць у розных формах (ад бацькоўскай падтрымкі да

спецыяльных урадавых конкурсаў-грантаў, вызваленняў ад аплаты ці нават выплат стыпендый прэтэндэнту). Праводзяцца на базе універсітэтаў, музеяў, даследчыцкіх цэнтраў.

Поўную інфармацыю пра тэрміны і умовы прыему прасцей за ўсё ў кожным выпадку атрымаць непасрэдна ад установы. Каго прыведзены набор не задаволіць – больш поўны можна знайсці на старонках спецыяльнага выдання (10).

**International Summer School of Museology**
Masaryk University
Zerotinovo namesti 9
Brno 60177
Czech Republic

**Smithonian Institution** – Office of Museum Programs
Smithonian Institution
A & I. Bldg, 900 Jefferson Dr. SW
USA

**Department of Museology, Amsterdam School of the Arts**
Reinward Acadamie
Dapperstraat 315
Amsterdam 1093 BS
The Netherlands

**Department of Museum Studies**
University of Leicester
105 Princess Road East
Leicester LE1 7LG
United Kingdom

**Cultural Studies**
Umea University
Department of Museology
Umea S-901 87
Sweden

**Museum Study Program**
New York Yniversity
19 University Place,Sute 540
New York, NY 10003-4556
USA

**Якім чынам студэнт-музеёлаг можа ўплываць на змест і якасць лекцыйных курсаў?**

Праз сістэму ананімнага анкетавання. Напрыклад, у Нью-Ёркскім універсітэце студэнтам прапануецца анкета-ацэнка лектара і курса па наступнай форме:

**АЦЭНКА КУРСА**

Запрашаем Вас дапамагчы атрымаць нам наступныя звесткі. Гэта мусіць паспрыяць справе далейшага ўдасканалення курсаў.

Назва (нумар) групы______________________Час (Семестр)___________
Катэгорыя слухачоў______________________ Выкладчык_____________
Назва курса________________ __________________________________

**Ацаніце, калі ласка, па наступнай шкале:**

**1** – Нездавальняюча **2** – Часткова нездавальняюча **3** – Здавальняюча

**4** – Добра **5** – Выдатна

**Абвядзіце адпаведную лічбу:**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. Здольнасць выкладчыка абуджаць думкі: | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 2. Падрыхтаванасць выкладчыка да лекцый: | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 3. Магчымасць выкладчыка адказваць на пытанні слухачоў: | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 4. Даступнасць выкладчыка для кансультацый : | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 5. Яснасць асноўных тэзісаў лекцый і дыскусій : | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6. Карыснасць тэкстаў і матэрыялаў: | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 7. Мэтазгоднасць заданняў па курсу : | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 8. Мэтазгоднасць выхадаў | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| (наведванняў) : | | | | | |
| 9. Агульная ацэнка выкладчыка: | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 10. Агульная ацэнка курса: | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |

11. Якія кнігі, артыкулы Вы знайшлі найбольш карыснымі?

____________________________________________

12. З якіх практычных заданняў Вы атрымалі найбольшую карысць?

____________________________________________

13. Ці быў час правядзення заняткаў зручным?

____________________________________________

14. Рэкамендацыі ці каментары?

____________________________________________

**ДЗЯКУЙ.**

**Хто можа даць грошы на музейнае даследаванне ці навучанне за мяжою?**

Толькі ў ЗША існуе некалькі дзясяткаў фондаў, якія можна зацікавіць ваша персона. Вось пералік некаторых з іх:

Center for Museum Studies, Smithonian Institutioin
Arts and Industries Building,
Room 2235
900 Jafferson Dr.
Washington, DC 20560

The Foundation Center
79 Fifth Avenue
New York, NY 10003

The J. Paul Getty Museum
Education and Academic Affairs
Department
PO Box 2112
Santa Monica, CA 90407-2112

The Getty Grant Program

401 Wirlshire Blvd, Suite 1000

Santa Monica, CA 90404-1455

National Endowment for the Arts (NEA)

1100 Pennsylvania Avenue NW
Washington, DC 20506

National Endowment for the Humanities (NEH)
1100 Pennsylvania Avenue NW
Washington, DC 20506

Office of Fellowship and Grants,
Smithsonian Institution
955 L'Enfant Plaza
Suite 7300
Washington, DC 20560

US/ICOMOS
1600 H St. NW
Washington, DC 20006 (11).

Перад вылетам прайсці інструктаж у Заслаўі. Абавязкова.

*Літаратура*

*10. Edson, G. International Directory of Museum Training. London and New York, Routledge, 1995.*

*Аляксандр Калбаска, прафесар ЕГУ,*
*дырэктар Запаведніка ў 1988-1994 і 1997-2000 гадах,*
*aliaksandr.kalbaska@ehu.lt*

**На свяце ў Маладзечна**

Наш музей-запаведнік актыўна працягвае весці сваю выязную працу або працу па-за межамі ўласнай музейнай прасторы. Прыкладаў яе рэалізацыі можна прыводзіць шмат, мы ж, у нашай газеце, прыводзім толькі пэўныя з іх, каб нашы чытачы мелі магчымасць атрымаць агульнае ўяўленне аб гэтай працы.

Так, напрыклад, 10-11 чэрвеня нашы супрацоўнікі прымалі ўдзел у Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі "Маладзечна", у спецыяльна адведзенай прасторы пад назвай "Партал часу". Аляксандр Рак, Алена Пакінка, Вольга Зязетка, Генадзь Сівохін і Ксенія Сямашка прэзентавалі старажытную гісторыю Заслаўя X-XII стст. Гасцей сустракаў анімаваны персанаж – Рагнеда, ролю якой выконвала наша супрацоўніца, апранутая ў гожы строй. Адмыслова абсталяваная ў павільёне часовая экспазіцыя сама па сабе ўяўляла выдатную фотазону, але кожны ахвотны

мог, апрача таго, сфатаграфавацца і з Рагнедай, і з рэчамі, вызначанымі для фотазоны: мячом, кальчугай і шлемам. Госці ахвотна падыходзілі, выяўлялі жывую цікавасць да гісторыі, рабілі фатаздымкі.



*Элементы фотазоны, арганізаванай музеем-запаведнікам*




*Алена Пакінка пры часовай экспазіцыі музея-запаведніка "Заслаўе X-XII ст".*

Гэткім чынам музей-запаведнік дадаў сваю "нотку" гісторыі ў атмасферу вялікага свята, якое адбываецца ў г. Маладзечна ўжо шмат гадоў, а ўпершыню святкавалася там у далёкім 1993 г.

***<u>Навуковая праца</u>***

## Заслаўе ў беларускай культуры

Культура – гэта не толькі сфера дзейнасці чалавека, але і шматгранны бесперапынны працэс творчасці, якая з'яўляецца адлюстраваннем унутранага стану творчай асобы, яе асэнсавання грамадства, сучаснасці і мінулага. Культура мае вялікае ўздзеянне на выхаванне чалавека, значна ўплывае на яго маральны стан, фарміраванне плыні эмоцый, эмацыйнага водгуку душы.

У даўнейшыя часы найбольшы ўплыў на выхаванне грамадства, складванне яго эмацыйнага стану рабілі кнігі, перыядычныя выданні (часопісы і газеты), пазней – радыё, а яшчэ пазней — кіно. Пры гэтым, трэба адзначыць, што ў наш час кіно мае нашмат большы ўплыў на грамадства, чым раней за яго існаваўшыя традыцыйныя сродкі выхавання. Кіно глядзяць з ахвотай усе – як дзеці, так і дарослыя, людзі сталага веку. Звычайна ў фільмы закладваюцца выхаваўчыя моманты, пэўныя нормы маралі, якія, незаўважна для сябе, успрымаюць гледачы: хвалююцца разам з героямі фільма, спачуваюць ім у выпрабаваннях, асуджаюць злодзеяў і падман, захапляюцца смеласцю і шчырымі ўчынкамі персанажаў.



*Кадр з фільма пра Хаіма Суціна (ў аб'екце "Хата завозніка")*

Вядома, што фільмы маюць пэўны падзел па відах, жанрах і г.д. Падзел гэты на наш час даволі дакладна распрацаваны, а колькасць жанраў наўпрост уражвае – яна вельмі вялікая. Што тычыцца відаў, то сярод іх, без заглыблення ў складанасці, вылучым найбольш для нас звыклыя: мастацкія фільмы і дакументальныя фільмы. Аўдыторыя першых

з'яўляецца найбольш масавай і шырокай, аўдыторыя другіх – больш вузкай, што абумоўлена зместам гэтага віду фільмаў, іх спецыялізаванасцю (дакументальныя фільмы навуковага або навукова-папулярнага кшталту).



*Кадр з фільма "Вольф Мессинг, видевший сквозь время" (аб'ект "Свіран")*

Цікава, што Заслаўе, у ліку іншых мясцін нашай краіны, таксама атрымала адлюстраванне ў кіно, як у мастацкім, так і ў дакументальным. Далёка не кожны горад Беларусі займеў такую шану, што маем успрымаць з гонарам. Вядома, што ў фільмах нярэдка паказваюцца падзеі мінуўшых часоў, якія часта немагчыма аднавіць у межах сучаснай забудовы гарадоў. Падрыхтоўваць спецыяльна для фільмаў аўтэнтычныя пабудовы – гэта справа доўгатэрміновая ды яшчэ і вельмі нятанная, менавіта таму пры здымках кіно нярэдка звяртаюцца да архітэктурнай спадчыны нашых продкаў, якая ўваходзіць у склад разнастайных музейных комплексаў. У выпадку Заслаўя – гэта этнаграфічны комплекс "Млын" нашага музея-запаведніка.

Так, напрыклад, на этнаграфічным комплексе "Млын" былі знятыя цалкам або ў эпізодах гэткія дакументальныя фільмы: пра Хаіма Суціна (эпізоды пра дзяцінства мастака, супрацоўнікі музея-запаведніка выконвалі шэраг роляў); эпізоды да серыі дакументальных фільмаў "Обратный отсчёт" (у іх ліку – серыя "Республика "Павлово"); фільм "Тысячелетний Заславль" (цалкам аб Заслаўі); фільм "Заслаўскімі пуцявінамі" (большая частка фільма прысвечана Заслаўю); "Хроника Минского гетто" – "Рождённые дважды" (частка кінатрэлогіі); "1418 дней. История Победы" і іншыя. У ліку мастацкіх – эпізоды да фільмаў "Вольф Мессинг, видевший сквозь время", "Авантуры Пранціша Вырвіча", "Следы апостолов-2", "Ни шагу назад-2. На линии фронта", "Топор" і іншыя. Гэта далёка не поўны пералік, а толькі невялічкі абрыс такога пераліку.




*Барыс Харэвіч у сюжэце тэлеканала "АНТ" ("ОНТ", на аб'екце "Млын")*

Апрача акрэсленага вышэй адзначым яшчэ і той факт, што ў Заслаўе перыядычна завітвае тэлебачанне, каб зняць тут асобныя рэпартажы або эпізоды да сюжэтаў. Гэта, напрыклад, тэлеканалы "Беларусь-1", "Сталічнае тэлебачанне", "Беларусь-24", "РТР-Беларусь". Сюжэты на тэлебачанні – таксама пэўнае відэаўвасабленне Заслаўя, чымсьці блізкае да кіно, але ў асаблівым фармаце – фармаце стужкі навін.

Тут жа дадаюцца і асобныя відэа, якія здымаюцца прыватнымі наведвальнікамі Заслаўя, размяшчаюцца на розпага кшталту інтэрнэт-парталах і відэахостынгах, у сацыяльных сетках. Хай сабе такія відэа звычайна здымаюцца не на прафесіянальным узроўні, але і яны часам маюць пэўны сюжэт, задуманы аўтарам, і каларыт. У такіх відэа звычайна фігуруюць аб'екты нашага музея-запаведніка, археалагічныя і архітэктурныя помнікі мінуўшчыны Заслаўя. Гэта таксама частка відэавобраза Заслаўя, які ўтвараецца шматгранным чынам.

Усе адзначаныя вышэй фільмы, як і рэпартажы тэлебачання, дэманстраваліся шырокаму колу беларускай грамадскасці і пакінулі свой след у сферы беларускай культуры, паспрыялі трансляцыі яе каштоўнасцяў. Прыватнага кшталту відэасюжэты таксама дадалі пэўны плён у складванне агульнага вобраза, некаторыя з іх маюць тысячы праглядаў. Заслаўе – не проста старажытны горад, але і горад са сваёй кіна-відэагісторыяй, якая, маем на тое вялікае спадзяванне, і далей будзе пашырацца новымі прыкладамі плённай супрацы сучаснасці з мінуўшчынай. Чакаем стваральнікаў кіно на госці!

**Подстаканник – оригинальный предмет ушедшей эпохи**

Известные практически каждому из нас подстаканники появляются на территории Российской империи в XIX в. и продолжают распространяться в XX в. Территория Беларуси, как известно, в очерченный выше период входила в состав Российской империи, поэтому данное утверждение актуально и для Беларуси. Позднее подстаканник получил новую жизнь и в СССР, где он стал неотъемлимым атрибутом столовых и железной дороги.

Подстаканник появляется как предмет принципиально необходимый для чаепития из стеклянного стакана – подставка под стакан, ведь горячий стеклянный стакан просто невозможно было взять в руку, не получив ожога, без специального предмета, который представлял собой подстаканник. Первоначально он выполняет чисто утилитарную функцию, а затем превращается и в элемент украшения, изящный в своём исполнении предмет, нередко несущий в себе раскрытие какого-либо сюжета, заложенного автором.





Падшклянікі (подстаканники) міралюбнай і касмічнай тэматыкі часоў СССР
з фондаў ДУ "ГКМЗ "Заслаўе"

Если обратиться ко временам Российской империи, то стоит заметить, что чаепитие тогда представляло собой особую традицию, которая не была чуждой ни поэтам, ни философам, ни даже художникам, давала возможность завести неспешный разговор и одновременно отдохнуть. Чаепитие нашло своё отражение в разных сферах культуры: живописи, литературе и других. Так, например, многим известна картина Василия

Перова "Чаепитие в Мытищах, близ Москвы" (1862 г.), которая, хоть и имеет в своей основе сатирический сюжет, отражает некоторые пороки общества, всё же обращает нас и к существующей традиции чаепития. В те времена мытищенская вода определялась московской публикой в качестве самой вкусной и лучшей для чаепития, поэтому Мытищи были популярным местом для чаепитий. Именно в Мытищах затем возникнет музей подстаканников и предметов для чаепития, коллекция которого занесена в Книгу рекордов Гиннеса.

В нашем историко-культурном музее-заповеднике "Заславль" коллекция подстаканников значительно уступает коллекции музея в Мытищах, включает в себя небольшое количество предметов и входит в состав коллекции "Металл". Однако, следует заметить, что и у нас подстаканники повсеместно бытовали в домах людей, и среди них можно встретить довольно интересные экспонаты, отражающие целую эпоху, различные тематические блоки. Так, например, на них отражена тема природы (зубр), космическая тема (спутник, звёзды, луна), а также тематика мира ("Миру – мир!") на земле и другое. Большая часть предметов коллекции относится к советской эпохе.

Первые подстаканники в Российской империи выпускались в Туле, на оружейном заводе, главным образом – из латуни, без каких-либо украшений на поверхности изделия. Внешний вид подстаканников меняется в середине XIX в. именно тогда, когда за создание такого типа изделий взялись ювелиры. С тех пор подстаканники начали украшать фигурками, орнаментами, покрывать эмалью, изготавливать их из серебра различной пробы. Подстаканники из драгоценных металлов, выполненные в качестве художественной работы высокого стиля, подчёркивают статус хозяина в глазах его гостей, несут репрезентативную функцию. В таком виде эти предметы красовались в сфере аристократического общества. Однако, в более простом и дешёвом исполнении, подстаканники часто встречались также и вне великосветского общества – в кабаках и трактирах, выполняя свою практическую функцию на протяжении десятилетий.

Времена меняются, разрушаются старые, создаются новые государства, а подстаканник всё так же незаменим в быту и признан народом. Возвращаясь к уже выше упомянутым советским временам, следует отметить, что творцам Октябрьской революции подстаканники также пришлись по вкусу: он не только помогает пролетариям защищать свои ладони от горячих стеклянных стаканов, но и превращается в средство идеологической работы, в средство пропаганды. Так, например, на подстаканниках появляются изображения государственных символов –

"Серп и молот", портреты вождей пролетариата, Московский кремль и прочее.

Расцвет советской эпохи подстаканника относится к концу 1940-х-началу 1970-х гг. Подстаканники выпускались на 15 крупных гражданских предприятиях и на некоторых военных заводах. Нередко материалом для их штамповки выступал сплав трёх металлов: меди, никеля и цинка; мельхиор, алюминий, нержавеющая сталь. Закат же советской эпохи подстаканника ознаменовался освоением массового выпуска изделий из пластмассы, которые затронули и сферу пищевой промышленности. Сохранить же образ подстаканника в людской памяти и массовом сознании помогла железная дорога, превратившаяся в "островок" сохранения традиции использования подстаканника. Каждый ярко может себе представить образ проводницы пассажирского поезда, разносящую людям чай, который непременно будет в стеклянных стаканах, а стаканы эти – в подстаканниках.

В наше время выпуск подстаканников не остановился (как штучный – авторский, так и заводской), но сфера их употребления на современном этапе представляется очень узкой, ограничиваясь, главным образом, любителями этого старинного и давно знакомого людям изделия. Сейчас подстаканник, в большинстве случаев, представляет собой предмет, использующийся для украшения интерьера (стиль под старину), предмет частного или музейного коллекционирования, а не изделие, принципиально необходимое для чаепития.

*Литература*

*1. Чаепитие в Мытищах, близ Москвы, Перов, 1862 [электронный ресурс] – Музеи мира – Картины русских художников: https://muzei-mira.com/kartini_russkih_hudojnikov/1561-chaepitie-v-mytischah-bliz-moskvy-perov-1862.html. – Дата доступа: 15.06.2022 г.*

2. Чай из подстаканника [электронный ресурс] – Русская кухня: *http://russkayakuhnya1.ru/eto-interesno/chay-iz-podstakannika.html.*

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.